бытовом общении, поскольку содержит глубокую и прочную национальную основу. Поэзия, живопись и другие области художественной культуры избегают прямолинейности, а вместо этого фокусируются на иносказательности. Китайская теоретическая мысль также базируется на иносказательности произведений искусства, которые являются реальными в виртуальном и виртуальными в реальном.

1. *Ду Даомин.* О стремлении к иносказательной и неявной красоте в эпоху поздней Тан и Пяти династий / Ду Даомин // Китайская эстетика. – 2018. – № 2. – С. 89–108. – На кит. яз.: 杜道明. 论晚唐五代对含蓄蕴藉之美的追求 中国美学 2018年第2期. – 页 89–108.

2. *Кэ Сячжэнь.* О «знании», «энергии» и «намерении» в книге Лу Цзи «Вэнь Фу» / Кэ Сячжэнь // Молодые литераторы. – 2013. – № 30. – С. 32–33. – На кит. яз.: 柯遐贞. 论陆机《文赋》中的“知”、“能”与“意” 青年文学家 2013年第30期. – 页 32–33.

3. *Ло Цзэсун.* О генеративной основе иносказательности / Ло Цзэсун // Журнал Цзинань (философия и социальные науки). – 1998. – № 23. – С. 35–42. – На кит. яз.: 骆泽松. 论含蓄的生成基础 暨南学报（哲学社会科学）1998年第03期. – 页 35–42.

4. *Ху Цзинчжи.* Изображение и идея в Китае / Ху Цзинчжи // Литературное обозрение. – 2020. – № 12. – С. 12–125. – На кит. яз.: 胡经之. 意象经营意境生中国 文艺评论 2020年第12期. – 页 12–125.

5. *Чжу Сунмяо.* Об эстетике «ничто» Чжуанцзы / Чжу Сунмяо // Ухань : Изд-во Уханьского ун-та, 2017. – 270 с. – На кит. яз.: 朱松苗. 论庄子之“无”的美学 武汉 武汉大学出版社 2017年. – 270 页.

**Ю. С. Барадзін,** *аспірант установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **А. Д. Крывалап,**
*кандыдат культуралогіі,*
*дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# СКАНДЫНАЎСКІ ВАРЫЯНТ ТРЫЯДЫ ІНДАЕЎРАПЕЙСКІХ БАГОЎ

З часоў глыбокай старажытнасці, калі існаваў язычніцкі пантэон, індаеўрапейскія народы пакланяліся язычніцкім багам, згрупаваным па трыядах. Французскі міфолаг-лінгвіст

Жорж Дзюмезіль у навуковым творы «Вярхоўныя багі індаеўрапейцаў» даследаваў, што протаіндаеўрапейцы сацыяльна дзяліліся на касты: жрацы, ваяры і простыя людзі (земляробы ці гандляры) [1, с. 30], а таксама прытрымліваліся таго, што нельга было адносіцца да трох сацыяльных груп адначасова. Да якой з трох кастаў адносіліся бацькі, да адпаведнай сацыяльнай групы адносіліся і іх дзеці: а пераход з адной касты ў іншую немагчымы, паколькі прыналежнасць да яе перадавался нашчадкам у спадчыну ад продкаў.

Згодна канцэпцыі Жоржа Дзюмезіля, ва ўсіх індаеўрапейскіх міфалогіях існуе варыянт трыяды багоў, дзе кожная з іх кіруе адной з трох сацыяльных груп. Напрыклад, у індыйскай міфалагічнай трыядзе (у яе ўваходзяць парныя багі), кастай жрацоў кіруюць Мітра і Варуна, за ваяроў заступаюцца Індра і Агні, два багі Ашвіна – на баку земляробаў [1, с.18].

Беларускія міфолагі – Аляксей Ненадавец і Вячаслаў Калацэй, даследуючы беларускую міфалогію ў параўнанні з іншымі індаеўрапейскімі міфалогіямі, вызначылі, што ў скандынаўскай міфалогіі ад першабагоў – Буры і яго сына-аса Бора пайшла першапачатковая скандынаўская трыяда братоў – стваральнікаў космасу: Одзін, Ві і Велі [2, с. 46]. Забіўшы волата Іміра, яны з частак яго цела стварылі сусвет [3, с. 25]. Такім чынам, вярхоўны бог Одзін і яго браты адносяцца да першай трыяды. Затым, калі ўжо сусвет створаны, у скандынаваў з'яўляецца новы ўзор індаеўрапейскай трыяды: Одзін, Тор і Фрэйр [1, с. 59]. У скандынаўскім грамадстве часоў ранняга Сярэдневякоўя вярхоўныя служыцелі багоў – язычніцкія святары, ваяўнічае саслоўе – вікінгі і гаспадарчая каста – простыя людзі, што апрацоўвалі зямлю. Па протаіндаеўрапейскім узоры канчаткова сфарміраваўся скандынаўскі варыянт трыяды галоўных багоў.

У скандынаўскіх жрацоў вярхоўным і галоўным богам-суддзёй быў Одзін [Там жа, с. 141], які таксама Усебацька вікінгаў, усіх скандынаваў і багоў. Як бог-суддзя Одзін вырашае іх лёс. Функцыі бога вайны ён перадаў аднаму са сваіх сыноў – грамабою Тору [Там жа, с. 139]. Тор, кіруючы вайсковай кастай скандынаўскіх вікінгаў, з'яўляецца таксама ўладальнікам свяшчэннага молата Мьёльнір, з маланкамі і громам. Працавітым земляробам са скандынаўскага пантэону ў трыядзе

дапамагае Фрэйр, які адначасова бог урадлівасці, сонца і лета [Там жа, с. 140].

Да жаночай трыяды ў скандынаўскай міфалогіі адносяцца тры норны (багіні лёсу): Урд (лёс), якая прадзе ніткі лёсу; Вердандзі (скручвае ніткі) і Скульд (абразае нітку). Яны вырашаюць лёсы багоў і людзей.

Одзін, Тор і Фрэйр, займаючы першае месца ў скандынаўскай трыядзе, адносяцца таксама да «Упсальскай трыяды», паколькі яны мелі агульнае язычніцкае капішча ў шведскай Упсале [Там жа, с. 138].

Скандынаўскі варыянт язычніцкай трыяды назіраецца і ў іншых індаеўрапейскіх міфалогіях. У трыяду старажытных грэкаў і рымлян уваходзяць Зеўс і Юпітэр (падобна Одзіну з’яўляюцца вышэйшымі багамі-суддзямі ў касце жрацоў), Афіна і Марс (выконваюць функцыі кіравання кастай ваяроў) і Апалон і Квірын (заступнікі касты земляробаў, якія, як скандынаўскі Фрэйр, кіруюць сонцам) [Там жа, с. 114].

У навукова-вучэбным дапаможніку «Параўнальная міфалогія» Вячаслаў Калацэй параўноўвае са скандынаўскай трыядай індаеўрапейскія трыяды балцкіх і беларускіх багоў. Спасылаючыся на багоў, адказных за святарскую, вайсковую і гаспадарчую функцыі ў кіраванні супольнасцю, на іх падабенства да Одзіна, Тора і Фрэйра, В. Калацэй вызначае з трыяды балцкай міфалогіі вярхоўнага бога-суддзю – Дзіеваса, бога ваяроў – Пяркунаса і багіню ўрадлівасці, жанчын і зямлі Жэміну. Жаночая балцкая трыяда падобна да скандынаўскай: Лайма (багіня шчасця), Дэкла (заступніца дзяўчат, якім выбірае жаніха) і Карта (вырашае лёс людзей). Язычніцкую трыяду беларускіх багоў узначальваюць Сварог, Пярун і Дажбог [2, с. 29]. Аляксей Ненадавец у даследаванні «Выявы міфалагічнага выраю» таксама падкрэслівае прыналежнасць балтаў і беларусаў да індаеўрапейскай сям’і разам са скандынавамі [4].

Параўноўваючы язычніцкія трыяды беларусаў, балтаў, індыйцаў, грэкаў і рымлян, якія са скандынавамі з’яўляюцца часткай агульнай індаеўрапейскай сям’і, з трыядай вікінгаў, можна прыйсці да высновы, што ва ўсіх індаеўрапейскіх міфалогіях сустракаецца скандынаўскі варыянт трыяды падобных багоў, якія кіруюць жрэцкім, земляробчым і вайсковым саслоўямі. Адзінае адрозненне скандынаўскай трыяды ад астатніх індаеўрапейскіх трыяд у тым, што Одзін, Тор і Фрэйр і

іншыя багі вікінгаў – такія ж смяротныя, як людзі, і ім наканавана загінуць у Рагнарок – скандынаўскі апакаліпсіс.

Тым не менш скандынаўскі варыянт трыяды індаеўрапейскіх багоў паспяхова рэканструюецца з дапамогай параўнальнай міфалогіі, якую даследавалі Жорж Дзюмезіль, Аляксей Ненадавец і Вячаслаў Калацэй, дэманструючы, такім чынам, дзіўныя падабенствы ў функцыях, што выконваюць індаеўрапейскія багі язычніцкіх трыяд.


1. *Дюмезиль, Ж.* Верховные боги индоевропейцев / Ж. Дюмезиль ; пер. с фр. Т. В. Цивьян. – М. : Наука, 1986. – 234 с.

2. *Калацэй, В. В.* Параўнальная міфалогія / Вячаслаў Калацэй. – Мінск : Зорны верасень : Паркус плюс, 2009. – 116 с.

3. Міфалогія. Духоўныя вершы / А. М. Ненадавец [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 471 с.

4. *Ненадавец, А. М.* Выявы міфалагічнага выраю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 263 с.



**Ю. А. Богданова,** *аспирант*
*учреждения образования*
*«Витебский государственный университет*
*имени П. М. Машерова».*
Научный руководитель – **М. Л. Цыбульский,**
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры изобразительного искусства*
*учреждения образования*
*«Витебский государственный университет*
*имени П. М. Машерова»*


## ПРОСТРАНСТВЕННО-ВРЕМЕННЫЕ МОДЕЛИ В БЕЛОРУССКОЙ СТАНКОВОЙ ЖИВОПИСИ 1960–1980-х гг.

В 1960–1980-х гг. белорусские живописцы через художественные образы стремились выявить соотношение момента с вечностью, настоящего с прошлым и будущим, мифа с реальностью, вневременного с историческим, постичь человеческое бытие в различных пространственных и временных масштабах. Пространство и время пронизывают концептуально ткань произведений, порождаются культурой эпохи, в которую были